УДК 930.1(476)«1917/1918»

**М. Я. Сяменчык**, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры (БДТУ)

# САВЕТЫ РАБОЧЫХ, САЛДАЦКІХ І СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ БЕЛАРУСІ (САКАВІК 1917 – САКАВІК 1918 ГГ.) У АСВЯТЛЕННІ АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Артыкул асвятляе айчынную гістарыяграфію Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.). Вызначана гістарыяграфічная перыядызацыя, ахарактарызаваны асаблівасці кожнага з яе этапаў. Названы творы айчынных аўтараў, якія ўнеслі найбольшы ўклад ва ўкараненне канцэпцыі аб ролі Саветаў як органаў дыктатуры пралетарыяту і сялянства ў рэвалюцыйных працэсах 1917–1918 гг. Паказаны сучасны стан і тэндэнцыі вывучэння пытання аб дзейнасці Саветаў Беларусі.

The article showcases domestic historiography of the Soviets of workers, soldiers and peasants deputies of Belarus during the February and October revolutions (March 1917 to March 1918). Defined historiography periodization, described the peculiarities of each of its steps. Named works of domestic authors, which have made the largest contribution to the implementation of concept on the role of the Soviets as bodies of the dictatorship of the proletariat and the peasantry in the revolution 1917–1918. Shows the current status and trends of the study of the Soviets of Belarus.

**Уводзіны.** У свядомасці грамадзян СССР 1917 год трывала асацыяваўся з Савецкай уладай, усталяванай рабочымі, салдатамі і сялянамі на чале з ленінскай партыяй. Значную ролю ў фарміраванні такога аб ім уяўлення адыграла і айчынная гісторыя. Гісторыя саміх Саветаў асвятлялася ў кантэксце дзейнасці партыі бальшавікоў. Невыпадкова ні адзін айчынны гісторык не абмінуў Мінскага Савета ў той час, як Магілёўскаму і некаторым іншым Саветам да апошняга часу не нададзена належнай увагі.

**Асноўная частка.** Вывучэнне і асвятленне дзейнасці Саветаў праходзіла ў некалькі этапаў і працягваецца ў наш час. На першым з іх – у 1920-х – першай палове 1930-х гг. аўтарамі публікацый аб Саветах з'яўляліся бальшавікі Віцебска, Мінска [1], Гомеля, Магілёва, Мазыра, Оршы [2]. Характэрна, што Саветы дакастрычніцкага часу падаваліся як грамадска-палітычныя арганізацыі, якія абаранялі новы лад, а таксама інтарэсы працоўных і салдат. Пасля Кастрычніка рабочыя Саветы апынуліся ў апазіцыі да бальшавікоў і былі разагнаны [3, с. 197–215].

Другі этап вывучэння Саветаў меў месца з канца 1930-х да другой паловы 1950-х гадоў, калі ўзнікла і ўкаранілася партыйная канцэпцыя Кастрычніка, якая абапіралася на ленінскую тэарэтычную спадчыну і сталінскую «Историю ВКП(б). Краткий курс». Палітычна адукаванаму чалавеку належала ведаць, што Саветы рабочых і салдацкіх дэпутатаў з'яўляліся «органамі саюза рабочых і сялян супраць царскай улады і разам з тым – органам іх улады, органам дыктатуры рабочага класа і сялянства» [4, с. 27]; што з сакавіка па ліпень у Расіі існавала «двоеўладдзе» ў асобе Часовага ўрада і Саветаў; што ў ліпені ў выніку здрады згоднікаў уся ўлада перайшла ў рукі буржуазіі і г. д.

Вывучэнне Саветаў Беларусі ў азначаных рамках ускладнялася мізэрнай колькасцю пралетарыяту, падтрымкай Саветамі Часовага ўрада і іх суцэльным падарадкаваннем меншавікам, эсэрам і бундаўцам. Ускладняла становішча і тая акалічнасць, што пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі пераважная маса Саветаў адмовілася прымаць уладу, аддаючы перавагу нядаўна абраным органам самакіравання.

Недахоп фактаў і аргументаў на прадмет пацвярджэння тоеснасці рэвалюцыйных працэсаў у Беларусі і астатняй Расійскай імперыі з лішкам кампенсаваўся айчыннымі гісторыкамі шляхам актыўнага цытавання прац Леніна, Сталіна і палажэнняў «Краткого курса». Творы ж 1920-х – пачатку 1934 г. не ўкладваліся ў рэчышча новай канцэпцыі, папросту знішчаліся.

Такія навацыі можна знайсці ў манаграфіі Ф. Папова, прысвечанай М. Фрунзе, дзе Саветы называліся «другім урадам», «органамі саюза рэвалюцыйнага рабочага з рэвалюцыйным салдатам» [5, с. 27]. Тыя ж падыходы, тэрміналогія і ацэнкі падзей 1917 г. знайшлі адбітак у манаграфіі Л. Гапоненкі [6]. У гэтай працы Мінскі Савет падаваўся як «адзіна народная ўлада». Паведамлялася, быццам меншавікі, эсэры і беларускія нацыяналісты імкнуліся захапіць кіраўніцтва Саветам «іператварыць яго ў дадатак Часовага ўрада» [6, с. 35]. Аўтар сцвярджаў, што пасля перамогі ўзброенага паўстання ў Петраградзе «войскі Заходняга фронта пайшлі за рэвалюцыйным рабочым класам і разам з ім пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі ўзняліся на рашучы бой за ўладу Саветаў» [6, с. 118].

З асуджэннем сталінізму выкарыстанне даследчыкамі схем «Краткого курса» не перапынілася. Тым не менш, вывучэнне Саветаў у кантэксце дзейнасці партыі бальшавікоў зрабілася больш праўдзівым. Так, І. М. Ігнаценка ў сваёй манаграфіі [15] прывёў звесткі аб буйнейшых на той час Саветах, указаў на гіпербалізацыю асобнымі аўтарамі ролі бальшавікоў у арганізацыі

і працы Саветаў [7, с. 13–15], назваў тыя з іх, якія асудзілі анарха-бальшавіцкае выступленне 3–5 ліпеня. Аўтар першым з айчынных гісторыкаў указаў на тое, што ў беларускіх гарадах не было «рэвалюцыйнага пралетарыяту», што асобныя Саветы Беларусі адмовіліся браць уладу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі [7, с. 326–329].

Чарговым крокам у даследаванні рэвалюцый 1917 г., у тым ліку дзейнасці Саветаў, стаў выхад у 1967 г. калектыўнай манаграфіі «Победа Советской власти в Белоруссии». У пацвярджэнне схем з «Краткого курса» аўтары паведамілі, што ў сакавіку ў Мінску ўзнікла двоеўладдзе ў асобе Савета і грамадскага камітэта [8, с. 77]. Аўтары адзначылі, што ініцыятарамі стварэння Саветаў былі меншавікі і бундаўцы, але ў высновах гэтую ініцыятыву яны пакінулі «народным масам» [8, с. 86]. У пацвярджэнне тэзіса аб Саветах як «органах народнай улады» аўтары даводзілі факты аб устанаўленні Саветамі васьмігадзіннага працоўнага дня, утварэнні прафсаюзаў, фарміраванні міліцыі, правядзенні агітацыйна-прапагандысцкай і асветніцкай працы. Разам з тым, аўтары занадта перабольшвалі ролю Саветаў у барацьбе з карнілаўшчынай і тэмпы іх бальшавізацыі [8, с. 30, 81, 219]. Імі зроблена выснова, што ў кастрычніку не толькі Мінскі Савет, а і Мінскі камітэт РСДРП(б) зрабіліся палітычным і арганізацыйным цэнтрам падрыхтоўкі ўзброенага паўстання ў Беларусі» [8, с. 242].

У цэлым, аўтары манаграфіі выкарысталі велізарную колькасць новых, пераважна дакументальных матэрыялаў, а таксама існуючую гістарычную літаратуру, за выключэннем даваеннай, для таго, каб на мясцовым матэрыяле пацвердзіць распрацаваную У. Леніным канцэпцыю аб гістарычнай заканамернасці і непазбежнасці Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, дэмакратычным характары ўсталяванай улады Саветаў і вызначальнай ролі ў тым партыі бальшавікоў. Гэтыя палажэнні ляглі ў аснову такіх абагульняючых прац, як «Очерки истории КПБ» (1968), «Гісторыя Беларускай ССР» (1973), «История рабочего класса Белорусской ССР» (1984) і да нашых дзён натхняюць пракамуністычных прапагандыстаў.

У 1987 г. выйшла ў свет манаграфія П. К. Башко, адмыслова прысвечаная Саветам Беларусі [9]. Аўтар правёў даследаванне на аснове дасягненняў гістарычнай навукі Расіі і БССР, увёў у навуковы ўжытак знойдзеныя ў многіх архівах СССР матэрыялы і выкарыстаў велізарны пласт тэарэтычнай спадчыны У. Леніна. Менавіта ленінская трактоўка Саветаў як увасабленне непасрэдных органаў улады народа, органаў рэвалюцыйна-дэмакратычнай дыктатуры пралетарыята і сялянства [9, с.12] праходзіць праз усю манаграфію.

П. К. Башко слушна адзначыў, што небальшавіцкае кіраўніцтва Саветаў лічыла іх часовымі арганізацыямі, якія абавязаны выконваць у асноўным функцыі кантролю за дзеяннем органаў Часовага ўрада да склікання Устаноўчага сходу [9, с. 33]. Ён са спасылкай на У. Леніна аспрэчыў тэзіс, «нібыта ініцыятарам стварэння Саветаў у ходзе Лютаўскай рэвалюцыі былі дробнабуржуазныя партыі» [9, с. 11], і сцвярджаў, што «застрэльшчыкам арганізацыі Саветаў у Беларусі быў рабочы клас на чале з бальшавікамі» [9, с. 818].

У выпадку з характарыстыкай сацыяльнага складу сялянскіх Саветаў аўтар таксама абапіраўся на творы У. Леніна, які атаясамліваё іх з Саветамі салдацкіх дэпутатаў таму, што «асноўную масу салдат складалі сяляне» [9, с. 51]. У такім выпадку П. К. Башко варта было б патлумачыць, навошта салдаты стваралі ўласныя Саветы, а не карысталіся сялянскімі.

Аўтар падзяляў ленінскую ацэнку двоеўладдзя і пацвярджаў яго існаванне ў Беларусі на прыкладзе Саветаў і грамадскіх камітэтаў (пазней – камісарыятаў Часовага ўрада) [9, с. 64]. Ён падаваў азначаныя камітэты і камісарыяты як буржуазныя органы, нягледзячы на тое, што ў іх уваходзілі прадстаўнікі Саветаў.

Важнай часткай працы, якая сведчыць аб Саветах як органах улады, з'яўляецца матэрыял аб іх удзеле у выдаленні варожых ім элементаў з камісарыятаў, гарадскіх дум і земстваў, барацьбе супраць пагромаў, распаўсюджання рэакцыйнай літаратуры і г. д. [9, с. 66, 69–71, 82]. Але варта было б дадаць, што гэтыя акцыі не супярэчылі палітыцы органаў Часовага ўрада і адбываліся ў адным з ёй рэчышчы.

Аўтар станоўча ацэньваў тых Саветаў, якія дзейнічалі да ліпеня 1917 г. Ён адзначыў, што «ў сувязі з ліпеньскімі падзеямі двоеўладдзе было ліквідавана і ўсталявана дыктатура буржуазіі» [9, с. 134], што пад уплывам дробнабуржуазных партый Саветы прыйшлі ў заняпад» [9, с. 150]. Але такога не магло адбыцца, бо, як пісаў аўтар, у канцы жніўня «многія Саветы Беларусі адыгралі надзвычай важную ролю ў падаўленні карнілаўскага мяцяжа» [9, с. 220].

П. К. Башко яўна перабольшваў папулярнасць лозунга «Уся ўлада Саветам». «Напярэдадні Кастрычніка тыя Саветы, – піша ён, – якія пазбавіліся ад дробнабуржуазнага згодніцтва, саспелі да такога ўзроўню, што былі гатовы засяродзіць усю паўнату дзяржаўнай улады ў сваіх руках».

Заўважым, што восенню ў Беларусі з агульнай колькасці Саветаў (больш за 100) ўзяць уладу былі здольныя толькі 3–4 [9, с. 183]. Аб іх

«спеласці» сведчаць і далёка не мірныя спосабы пераходу ўлады да іх пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі [9, с. 215].

У цэлым, манаграфія П. К. Башко ўвабрала ў сябе лепшыя дасягненні тагачаснай партыйна-гістарычнай думкі аб Саветах у перыяд з Лютаўскай па Кастрычніцкую рэвалюцыю. Яго істотнай заслугай з'яўляецца падрабязны падлік і класіфікацыя ўсіх Саветаў Беларусі.

З улікам татальнага панавання КПСС выкладзеныя аўтарам палажэнні цалкам адпавядалі ленінскаму вучэнню аб сацыялістычнай рэвалюцыі і ў многім – «Краткому курсу ВКП(б)». Адсюль і тэзісы аб Саветах як органах дыктатуры пралетарыяту і сялянства, перапляценнях дыктатур, мірным развіцці рэвалюцыі, двоеўладдзі, буржуазным Часовым урадзе і інш. Раскрыццё тэмы адбывалася з класава-партыйных падыходаў пры абсалютызацыі прынцыпу партыйнасці. Выкарыстоўваючы мясцовы матэрыял, аўтар паказаў вядучую ролю ленінскай партыі ў стварэнні Саветаў Беларусі, іх далейшы ўдзел у разгроме карнілаўшчыны, працэс бальшавізацыі і саспявання да ўзяцця дзяржаўнай улады і ўсё тое, што дыктавалі ўмовы таго часу.

Адначасова выразна паказана антынародная дзейнасць буржуазнага Часовага ўрада, здрадніцкая роля эсэраў, меншавікоў, бундаўцаў, беларускіх буржуазных нацыяналістаў, якія перашкаджалі працоўным і рэвалюцыйным салдатам на чале з партыяй бальшавікоў змагацца за ўладу Саветаў.

Не менш важныя высновы аб тым, як адбывалася ператварэнне Саветаў у органы ўлады пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, змяшчаліся ў манаграфіі А. І. Несцярэнкі і У. П. Асмалоўскага [10]. Паводле аўтараў, «Саветы адыгралі рашаючую ролю ў падрыхтоўцы і правядзенні ўзброенага паўстання і ўстанаўленні дыктатуры пралетарыята» [10, с. 204]. Звергнуўшы ўладу буржуазіі і памешчыкаў, – запісалі аўтары, – працоўныя Беларусі пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі ў кароткія для гісторыі тэрміны стварылі сістэму пралетарскіх дзяржаўных органаў – Саветаў рабочых салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў» [10, с. 203]. У пацвярджэнне сваіх высноў аўтары выкарысталі тыя ж, што і П. Башко, «першакрыніцы», метадалогію і г. д.

Які сэнс укладалі аўтары ў тэрмін «пралетарскія дзяржаўныя органы», якім чынам яны апынуліся ў непралетарскай Беларусі, які лёс напаткаў Саветы як грамадска-палітычныя арганізацыі і многае іншае, выразна выявілася толькі пасля краху КПСС і адмовы Беларусі ад савецкай і сацыялістычнай перспектывы.

Менавіта з гэтага часу, пачатку 1990-х гадоў, бярэ адлік чацвёрты этап вывучэння гісторыі Саветаў з уласцівымі яму зменамі навуковых парадыгм, адмовы ад ідэалагем «Краткого курса» і марксісцка-ленінскай метадалогіі. Навукоўцы атрымалі доступ да забароненай раней літаратуры, у тым ліку апублікаванай у 1920-1930-х гг., значна пашырылі кола вывучаемых крыніц і інш. Але трактоўка падзей 1917 г. у новай літаратуры заставалася амаль нязменнай. Такой яна, па сутнасці, засталася і ў чарговай манаграфіі акадэміка І. М. Ігнаценкі, за выключэннем хіба таго, што ў ёй адмаўлялася наяўнасць у беларускіх губернях двоеўладдзя [11, с. 34]. З цягам часу пра адсутнасць двоеўладдзя заявілі выконваючы абавязкі дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі М. С. Сташкевіч і член-карэспандэнт НАН Беларусі і П. Ц. Петрыкаў [12, с. 258].

Прызнанне адсутнасці двоеўладдзя ў Беларусі пасля Лютаўскай рэвалюцыі, акрамя іншага, дазваляе ацаніць прызначэнне Саветаў, іх сапраўдную ролю ў дэмакратызацыі ладу, рэвалюцыянізаванні мас, вызначэнні сацыяльнай апоры бальшавікоў падчас Кастрычніцкай рэвалюцыі.

На аснове шырокага кола архіўных крыніц, апублікаваных дакументаў, тагачаснай перыядычнай прэсы, новай гістарычнай літаратуры расійскіх і замежных аўтараў, «вызваленых» са спецсховішчаў прац першага пакалення савецкіх гісторыкаў, эмігрантаў і інш., аўтару ўдалося апублікаваць аб'ектыўныя, навукова абгрунтаваныя матэрыялы аб гісторыі Саветаў Беларусі азначанага перыяду [13]; [14] і стане айчыннай гістарыяграфіі 1917 г. [15]. У яго працах асветлены найбольш значныя акалічнасці іх стварэння: час, ініцыятары, сацыяльны і партыйны склад, узаемаадносіны з уладай і вышэйшымі органамі рэвалюцыйнай дэмакратыі і многае іншае, што дазваляе вызначыць іх месца і ролю ва ўсталяванні новага ладу пасля звяржэння самадзяржаўя. Аўтару ўдалося адысці ад міфалагізаваных уяўленняў аб бальшавіках у рэвалюцыйным працэсе і ўсенароднай падтрымцы Саветаў як органаў дыктатуры пралетарыята. З новых падыходаў гэтыя ж аспекты асветлены ў 4 і 5 тамах «Гісторыі Беларусі» (2005, 2006).

**Заключэнне.** Такім чынам, даследаванне на розных этапах гісторыі Саветаў Беларусі перыяду Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый мела важныя для свайго часу вынікі, што знайшло ўвасабленне ў асобных працах. Усе яны, напісаныя ў 1950–1980-х гадах пад пільным наглядам КПСС, маюць пераважна ідэалагічны характар. З улікам з'яўлення ў 2000-х гадах абагульняючых, свабодных ад ідэалагем «Краткого курса» прац па гісторыі Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый сучасны этап вывучэння

Саветаў спрыяе вылучэнню азначанай тэмы ў самастойную галіну даследаванняў і ўзбагачэнню айчыннай гістарыяграфіі аб'ектыўнымі навуковамі творамі.

### Літаратура

1. Кнорин В. Революция и контрреволюция в Белоруссии. Смоленск. 1920. 10 с.; Кнорин В. Г. Избранные статьи и речи / сост.: Н. В. Кузнецов [и др.]. Минск: "Беларусь", 1990. С. 303.

2. Дмитриев И. Октябрь в Орше // Пролетарская революция. 1922. № 10. С. 408–424; Костенко А. Из истории Речицкой организации РКП (б) // Изв. Гом. Губкома РКП(б). 1922. № 27. С. 31–35; Клебанов С. Могилев в 1917 году. // Изв. Гом. Губкома РКП(б). 1924. № 63/64. С. 95–98; Кастрычнік на Беларусі. Зб. артыкулаў і дакумэнтаў / улажыў С. Агурскі. Менск: ДВБ, 1927. 488 с.; Кастрычніцкая рэволюцыя на Беларусі. Зб. успамінаў і артыкулаў / пад рэд. Прусліна. Менск: ДВБ, 1934. 120 с.

3. Красная быль: Большевики в Витебске. Сб. ст., воспоминаний и материалов. Витебск: 1923. 220 с.

4. История Всесоюзной коммунистической партии (большевиков). Краткий курс / под ред. Комиссии ЦК ВКП(б). М., Изд-во политической литературы. 1938. 360 с.

5. Папоў Ф. О. Дзейнасць М. В. Фрунзе ў Беларусі ў перыяд падрыхтоўкі Вялікай Кастрычніцкай социялітычнай рэволюцыі. Мінск, Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Рэдакцыя палітычнай літаратуры, 1951. 132 с.

6. Гапоненко Л. Солдатские масы Западного фронта в борьбе за власть Советов (1917). М.: Государственное издательство политической литературы, 1953. 196 с.

7. Игнатенко И. М. Беднейшее крестьянство – союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции (1917–1918 гг.). Минск: Изд-во Министерства высшего, среднего специального и профессионального образования БССР, 1962. 500 с.

8. Победа Советской власти в Белоруссии. Минск.: Наука и техника, 1967. 508 с.

9. Башко П. С. Советы рабочих, солдатских и крестьянских депутатов Белоруссии (март – октябрь 1917 г.) / под ред. И. М. Игнатенко. М.: Наука и техника, 1987. 254 с.

10. Нестеренко Е. И., Осмоловский В. П. Советы Белоруссии, окт. 1917 – янв. 1919 г. / под ред. И. М. Игнатенко. Минск: Наука и техника, 1989. 232 с.

11. Ігнаценка І. М. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі: асаблівасці і вынікі. Мінск: БелНДЦДАС, 1995. 270 с.

12. Петриков П. Т. Очерки новейшей историографии Беларуси (1990-е начало 2000-х годов). Минск : Белорус. наука, 2007. 292 с.

13. Сяменчык М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.): у 2 ч. Мінск: БДПУ, 2001. Ч. І: Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах дэмакратычнага рэжыму. 200 с.

14. Сяменчык М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 – сакавік 1918 гг.): у 2 ч. Мінск: БДПУ, 2001. Ч. ІІ. Грамадска-палітычнае жыццё ва ўмовах складвання таталітарнага рэжыму. 160 с.

15. Сяменчык М. Я. Асвятленне рэвалюцыйных падзей у сучаснай гістарычнай літаратуры // Методология исследований истории Беларуси: проблемы достижения, перспективы : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 22–23 окт. 2008 г. / редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. Минск: Беларус. навука, 2009. 256 с. (184–188).

*Паступіў 11.03.2014*